*С. А. Пацыенка, канд. культуралогіі,*
*дац. каф. менеджменту СКД БДУКМ*

# КУЛЬТУРНАЯ ПРАСТОРА ЗАМКАЎ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў КАНТЭКСЦЕ ДЫНАМІКІ ДУХОЎНАЙ КУЛЬТУРЫ МАГНАТАЎ

У працэсе фарміравання духоўных каштоўнасцей значную ролю адыгрываюць матэрыяльныя ўмовы. У сувязі з гэтым пры вывучэнні духоўнай культуры магнатаў Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ) актуалізуецца значнасць даследавання прасторы прыватнаўласніцкіх замкаў-рэзідэнцый. Успрыманне замка, з аднаго боку, як цэнтра радавой гісторыі, а з іншага – як архітэктурнага аб’екта, адлюстроўвае дуалізм духоўнага і матэрыяльнага пачаткаў, якія спалучыліся ў гэтым культурным феномене. Шматбаковасцю значэнняў архітэктурны аб’ект абавязаны таму, што «архітэктура складаецца не толькі з архітэктуры: вузкаархітэктурныя канструкцыі знаходзяцца ў суадносінах з семіётыкай пазаархітэктурнага шэрагу – рытуальнай, побытавай, рэлігійнай, міфалагічнай, – усёй сумай культурнага сімвалізму» [4, с. 676].

Культурная прастора, якая ствараецца ў працэсе чалавечай дзейнасці і аб’ядноўвае як матэрыяльныя артэфакты, спосабы іх вытворчасці, так і духоўныя ўзоры, сэнсы і г. д., увасабляе каштоўнасна-сэнсавы змест пэўнай культуры. Стварэнне ўнікальнай культурнай прасторы – гэта спецыфічныя працэдуры фарміравання штучнага асяроддзя людзьмі, якое здзяйсняецца ў адпаведнасці з нормамі і каштоўнасцямі канкрэтнай чалавечай супольнасці.

Калі разглядаць замак як асаблівую культурную прастору, якая стваралася групай прадстаўнікоў вышэйшага саслоўя, ён уяўляе сабой сканцэнтраваны базісны светапогляд магнатаў. Замак з’яўляўся жыллёвай пабудовай, якая займала канкрэтнае месцапалажэнне ў прасторы. Дзякуючы магутнасці мураваных канструкцый, замак існаваў у часе па некалькі стагоддзяў: у яго межах праходзіла жыццё шэрагу пакаленняў арыстакратычнага роду. Успрыяцце магнатамі ўзаемасувязі часавых і прасторавых адносін у межах замкавай пабудовы альбо хранатопа замка адлюстравалі дынаміку духоўнай культуры магнатаў.

У сучаснай беларускай навуцы не існуе адзінага агульнапрынятага вызначэння тэрміна «замак». Складанасці выкліканы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тым, што за час свайго існавання, неаднаразова набываючы новыя значэнні, слова «замак» значна пашырыла першапачатковы сэнс. У пісьмовых крыніцах розных часоў пад «замкам» разумеліся разнастайныя ўмацаванні, былыя дзяцінцы гарадоў, умацаваныя сядзібы феадалаў, мураваныя турмы і інш.

Беларускія даследчыкі даюць некалькі трактовак паняцця «замак». М. Ткачоў вызначаў замак як «замкнёны комплекс абаронных збудаванняў жылых і іншых пабудоў, абнесены лініяй умацаванняў з зямлі, дрэва і каменю» [5, с. 401]. Аўтары выдання «Архітэктура Беларусі» падаюць блізкае азначэнне: «замак – умацаванае жыллё феадала, а таксама сярэдневяковы комплекс абаронных збудаванняў, жылых, гаспадарчых і культавых пабудоў на зручных для абароны месцах, аб'яднаных лініяй умацаванняў» [2, с. 525]. Даследчык Ю. Заяц у якасці замкаў разглядаў «вялікакняскія (каралеўскія) рэзідэнцыі, сеньёральныя рэзідэнцыі (уладальніцкія замкі ў прыватнаўласніцкіх гарадах і мястэчках, цэнтрах латыфундый), умацаванае жыллё феадалаў у вясковай мясцовасці» [1, с. 67].

Гэтыя вызначэнні па асноўных пазіцыях (прызначэнне, канфігурацыя) супадаюць з трактоўкай паняцця «замак», якое выкарыстоўваюць польскія даследчыкі. Так, Ё. Багданоўскі вызначае замак як «самастойную абарончую замкнёную забудову, узнікшую ў часы Сярэднявечча, якая сумяшчае дамініруючую абарончую функцыю з жыллёвай і гаспадарчай» [6, с. 563].

У адпаведнасці з класіфікацыяй М. Ткачова, замкі ВКЛ падзяляліся на дзве асноўныя групы: агульнадзяржаўныя (XIII–XIV стст.) і прыватнаўласніцкія (XV–XVIII стст.). Агульнадзяржаўныя замкі прызначаліся пераважна для правядзення вайсковых дзеянняў. Патрэбнасці іх жыхароў абмяжоўваліся забеспячэннем бяспекі, таму ўсе элементы пабудовы неслі функцыянальную нагрузку з мінімальным улікам патрабаванняў да камфортнасці і дэкаратыўнасці. Асноўнай задачай будаўнікоў такіх замкаў было стварэнне недасягальнага для ворага аб'екта. Выражэнне гэтай ідэі адлюстравана ў кампазіцыйным прынцыпе Навагрудскага, Гродзенскага Старога, Крэўскага замкаў, якія ўяўляюць сабой цэльныя, кампактныя пабудовы.

У XIV – пачатку XV ст. ініцыятарам будаўніцтва замкаў выступала дзяржава, паколькі замкі з'яўляліся важнымі стратэгічнымі пунктамі, а іх утрыманне патрабавала значных выдаткаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З перамогай ў Грунвальдскай бітве (1410) на некаторы час знікла непасрэдная вайсковая пагроза, што спрыяла ўзмацненню эканамічнага становішча магнатаў. Акрамя таго, магнатэрыя значна ўзбагацілася за кошт падараванняў вялікіх князёў. У выніку ў XVI ст. актывізавалася будаўніцтва прыватнаўласніцкіх замкаў – рэзідэнцый феадалаў.

У прыватнаўласніцкім замкавым будаўніцтве ўвасобіліся светапоглядныя ўстаноўкі магнатаў. Усведамленне свабоды адлюстравалася ва ўспрыяцці замка як сімвала абсалютнай арыстакратычнай незалежнасці. Як адзначыў М. Бярдзяеў: «Свабода была перш прывілеяй арыстакратыі. Феадальны рыцар абараняў сваю свабоду і незалежнасць у сваім замку са зброяй у руках. Пад'ёмны мост быў абаронай свабоды феадальнага рыцара, свабоды не ў грамадстве і дзяржаве, а свабоды ад грамадства і дзяржавы» [3, с. 106]. У развіцці і пашырэнні прыватных ініцыятыў у замкавым будаўніцтве, якое праявілася ў стварэнні ўласнай умацаванай прасторы, адлюстраваўся працэс усведамлення ўласнай значнасці і права на свабоду прадстаўнікоў магнацкай супольнасці.

Сутнасныя змены ў духоўнай культуры магнатаў адлюстраваліся ў арганізацыі прыватнаўласніцкіх уладанняў. Пераход да культуры Новага часу значна трансфармаваў культурную прастору замкаў. Розніца паміж сярэднявечнымі і рэнесансавымі ідэямі адлюстравалася ў формах замкавага дойлідства. Так, раннія агульнадзяржаўныя замкі характырызаваліся аднолькавай тыповасцю (напрыклад, вельмі нязначная розніца ў архітэктурна-планіровачным, кампазіцыйным, колеравым вырашэнні Лідскага і Крэўскага замкаў-кастэлей). У прыватнаўласніцкім дойлідстве пры ўсёй агульнасці архітэктурных форм і набора дэкаратыўных элементаў не існуе пары падобных замкаў. Наадварот, дэкларуецца ўнікальнасць асобнай замкавай пабудовы [напрыклад, Геранёнскі (пач. XVI ст.), Нясвіжскі замкі (к. XVI ст.) і інш.]. Замкавая архітэктура гэтага перыяду актыўна імкнулася да разнастайнасці форм.

Паступова задачы абароны саступалі месца рэпрэзентатыўнай значнасці, і ўжо ў XVII ст. некаторыя замкі пачалі абкружацца штучна створаным ландшафтам – паркамі, «італьянскімі садамі», вадаёмамі і іншымі формамі ландшафтнага дызайну. Пачынаючы з канца XVII ст. на землях ВКЛ намеціўся паступовы працэс замены замкавай архітэктуры палацавай. Маналіт-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

насць мураванага замка разбілася на асобныя, расцягнутыя ў прасторы больш дробныя часткі палацавых і сядзібных комплексаў.

У XVIII ст. галоўнымі патрабаваннямі магнатаў да жылля сталі камфорт і рэпрэзентатыўнасць. Замак прызначаўся не толькі для абароны, але ўсё больш для зручнага пражывання гаспадароў і іх шматлікіх гасцей. Стыль і вобраз жыцця магнатаў ператварылі замкі ў культурна-забаўляльныя цэнтры.

Заняпад уласна замкавага будаўніцтва быў абумоўлены як знешнімі фактарамі (агульнадзяржаўны крызіс), так і ўнутранымі (крызіс культуры арыстакратыі). Прычыны дзяржаўнага ўзроўню насілі палітычны і эканамічны характар. Зацікаўленасць краін-саюзніц ворагаў Рэчы Паспалітай у аслабленні вайсковай магутнасці краіны патрабавала адсутнасці ўмацаваных стратэгічных пунктаў, якімі з'яўляліся замкі. Непажаданым фактарам была наяўнасць эканамічна моцных магнатаў, з інтарэсамі якіх трэба было лічыцца.

Такім чынам, трансфармацыі культурнай прасторы замкаў ВКЛ адбываліся пад непасрэдным уздзеяннем арыстакратычнай культуры. Арганізацыя прасторы прыватнаўласніцкіх рэзідэнцый як арыстакратычнага ўніверсума ўвасобіла палітычнае значэнне, сацыяльны статус, мастацкія прыхільнасці ўладальнікаў. Пад уздзеяннем духоўнай культуры магнатаў замкі сталі месцам лакалізацыі радавой гісторыі. Насычанасць унікальнай культурнай інфармацыяй зрабіла прастору рэзідэнцый адзіным культурным полем магнацкага роду, дынастычная пераемнасць забяспечвала захаванне і перадачу спадчынных каштоўнасцей і традыцый паміж прадстаўнікамі роду ў часе. У выніку светапоглядныя ўстаноўкі арыстакратаў-заказчыкаў прыватнаўласніцкіх замкаў ператварылі замак у прынцыпова новую жыллёвую прастору, напоўніўшы яе багатым культурным, эстэтычным сэнсам.

*1.* Археалогія Беларусі : у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т гісторыі ; рэдкал.: М. В. Біч [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 1998–2001. – Т. 4 : Помнікі XIV–XVIII стст. / В. М. Ляўко [і інш.]. – 2001. – 596 с.

*2.* Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. / рэдкал.: А. А. Воінаў [і інш.]. – Мінск : Беларус. энцыкл., 1993. – 620 с.

*3. Бердяев, Н. А.* Философия неравенства. О рабстве и свободе человека. Опыт эсхатологической метафизики / Н. А. Бердяев. – М. : Наука, 1995. – 267 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. *Лотман, Ю. М.* Семиосфера : сборник / Ю. М. Лотман. – СПб. : Искусство-СПБ, 2000. – 703 с.

5. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. В. Біч [і інш.]. – Мінск : Беларус. энцыкл., 1993–2001. – Т. 3. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – 1996. – 523 с.

6. *Bogdanowski, J.* Arhitektura obronna w krajobrazie Polski: od Biskupina do Westerplatte / J. Bogdanowski. – Warszawa ; Kraków : Wyd-wo Nauk. PWN, 2002. – 612 s.

***А. В. Щитцова,***
*аспирант каф. культурологии БГУКИ*

## СОВРЕМЕННЫЕ МОДИФИКАЦИИ ПРАВОВОЙ КУЛЬТУРЫ: ЕВРОПЕЙСКИЙ ТРЕНД

Правовая культура как неотъемлемая составляющая жизни человека, формирующая наравне с социокультурной средой его жизненный мир, представляет собой воспитание в человеке семьей и обществом культуры запретов и разрешений, то есть культуры его прав путем формирования морально-этических, норм и правил поведения согласно представлениям и традициям, существующим в данном обществе. Это приводит в конечном счете к становлению базовой правовой культуры личности, которая в полном смысле обнаруживает себя только тогда, когда человек в более зрелом возрасте оказывается способен воспринимать правовую действительность и анализировать как минимум неспецифическую правовую информацию, действуя на основе внутренних установок и побуждений в согласии с нормами закона, отражающими степень его правосознания.

Под неспецифической правовой действительностью мы понимаем общую правовую картину, сложившуюся в государстве, не требующую от человека для ее понимания специальной, углубленной юридической подготовки. Правовая культура каждого общества изначально находится в тесной взаимосвязи с вектором и уровнем его социокультурного развития. Так, несмотря на то, что в конституциях многих государств закреплены естественные права человека, нельзя проводить параллели и ставить знак равенства между правовой культурой граждан большинства стран бывшего Советского Союза и, например, стран Северной Америки или Западной Европы. Россия, Бела-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ